Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка. – Мн: БДПУ, 2000. Ч. 1. – 268 с. – Бібліягр.: с. 260–267. Ч. 2. – 213 с.

2. Верабей, А.Л. Беларуска-рускі паэтычны ўзаемапераклад 20–30-гадоў. – Мн., 1990.

3. Гарэцкі, М. Хрэстаматыя беларускае літаратуры. XI век. – 1905. – Вільна, 1922.

4. Зарэмба, Л.І. Я.Купала і М.Гарэцкі – перакладчыкі “Слова аб палку Ігаравым” // Полымя. – 1985. – №4. – С. 207–214.

5. Колесов, В.В. Свет и цвет в «Слове о полку Игореве» // «Слово о полку Игореве»: 800 лет. – М., 1986. – С. 215–230.

6. Купала, Я. Збор твораў: У 7 т. – Мн., 1974. – Т. 5. – С. 248–280.

7. Майхровіч, С.К. Слова аб палку Ігаравым. – Мн., 1968.

8. Памятники литературы Древней Руси. XIIвек. – М., 1980. – С. 372–387.

9. Попович, А. Проблемы художественного перевода. – М., 1980.

10. Пшыркоў, Ю.С. “Слова аб палку Ігаравым” у перакладзе Янкі Купалы // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства. – Мн., 1976. – Вып. 4. – С. 102–111.

11. Рагойша, В.П. Проблемы перевода с близкородственных языков. – Мн., 1980.

***Таццяна Ганчарова-Цынкевіч***
*(Мінск)*

## РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ ТЭМАТЫКА АПАВЯДАННЯЎ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

Максім Гарэцкі – адзін з прадстаўнікоў беларускай літаратуры, які свядома абраў свой шлях самаадданага служэння свайму народу, сваёй Бацькаўшчыне і ніколі не сыходзіў з яго. Заслугі М.Гарэцкага ў галіне нашай нацыянальнай культуры яшчэ і сёння не атрымалі сапраўднай і ўсебаковай ацэнкі даследчыкаў. Многія яго творы да сярэдзіны пяцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя былі невядомыя шырокай аўдыторыі. З 1930 года, калі пісьменнік быў беспадстаўна арыштаваны і сасланы, напісанае ім не выдавалася.

У М.Гарэцкага з самага пачатку яго творчасці было добрае адчуванне гісторыі, як ніхто з беларускіх празаікаў той пары, ён адкрываў перад чытачом складаны свет і час, даваў сваю чалавечую і мастацкую інтэрпрэтацыю. Цікава, што Кастрычніцкую рэвалюцыю пісьменнік сустрэў у Смаленску, і адразу стаў на бок новай улады. Працаваў камендантам жыллёвага аддзела, потым у газетах “Западная коммуна”, “Звезда”, актыўна друкаваў тут свае артыкулы і мастацкія творы. Крыху пазней (1921-1922), апынуўшыся ў Вільні пад палякамі, у газетах “Беларускі звон” і “Беларускія ведамасці” ён змяшчае такія свае апавяданні, як “У 1920 годзе”, “Апостал”, “Незадача”, “Фантазія”, “Усебеларускі з’езд 1917 года”, якія аказаліся потым па вызначэнні савецкай цэнзуры крамольнымі. У гэтых творах закранаюцца пытанні нацыянальнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адраджэння, гучыць тэма рэвалюцыі і паслярэвалюцыйнага жыцця, выказваюцца ідэі незалежнасці Беларусі, якія былі актуальнымі для пакалення нашаніўцаў. Такія пісьменнікі-адраджэнцы таго часу, як Я.Купала, Я.Колас, М.Багдановіч, А.Гарун, С.Палуян, В.Ластоўскі, Я.Лёсік і інш. у сваёй творчасці засяроджвалі ўвагу на пытаннях выжывання нацыі, захавання яе генафонду, бо ўжо тады, у першыя паслярэвалюцыйныя гады, была бачна казуістычнасць адбыўшыхся падзей. Як сапраўдны інтэлігент, Максім Гарэцкі не дапускаў магчымасці, што ў самім працэсе рэвалюцыі вядзецца вялікая палітычная гульня, вынікі якой для ўсіх слаёў насельніцтва абрынуцца сапраўднай катастрофай.

Так, у творы “У 1920 годзе” галоўны герой-апавядальнік, адзін з нацыянальных дзеячоў, які хоча перайсці на савецкую тэрыторыю, разважае пра жорсткасць бальшавікоў-чырвонаармейцаў, якія арыштавалі яго праваднiка: “Праваднiка майго, селяніна з бліжэйшай вёскі, свядомага, адданага ўсёй душою нашай справе чалавека, калі ён, пакінуўшы мяне ў вадзе, папоўз на бераг у разведку, – схапілі чырвонаармейцы-маскалі і, б’ючы прыкладамі, пагналі ў свой штаб. Мы разлічалі, што ён сустрэнецца з чырвонаармейцам-беларусам, які пры маім першым пераходзе памог мне пераправіцца. Але іх, відаць, ужо змянілі, рахуба наша не спраўдзілася, і чалавек прапаў.

Думка аб ім цяпер страшэнна мучыла мяне” [2, с. 106].

М.Гарэцкі ў гэтым апавяданні адкрыта крытыкуе бальшавіцкія парадкі і норавы, сам стыль жыцця новых уладароў: “... за малы хабар бальшавіку шчасна перабраўся цераз фронт...” [2, с. 211], – пахваляецца адзін з герояў апавядання “У 1920 годзе”.

Тэма рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, гора і пакут людзей, якімі суправаджалася вырашэнне нацыянальнага пытання на Беларусі, атраманне дзяржаўнасці гучыць у апавяданні “Усебеларускі з’езд 1917 года”. М.Гарэцкі не толькі асвятляе тут падзеі, дае маральную ацэнку паводзінам удзельнікаў з’езду, але і пратэстуе супраць любых формаў прымусу і непавагі да нацыянальных запатрабаванняў беларускага народа : “Быў гэта астатні дзень з’езду... неяк і радасна, і смутна.... Гэта ж не жарты: рэспубліку сваю, Беларусь няшчасную, на ногі ставім, зараз правіцельства народнае выбіраць будзем... Аж тут і крыкні нехта : бальшавікі прыехалі нас разганяць”[2, с. 136].

Пісьменнік выказвае думку, што новая ўлада не збіраецца даваць волю беларусам, пра што і распавядае селянін, удзельнік тых падзей. Калі бальшавікі сілай разагналі дэпутатаў, то ўсім стала зразумелай палітыка рэвалюцыйнага ўраду.

У творы “Незадача” аўтар малюе вобраз камуніста, які не ўпісваецца ў традыцыйна станоўчы літаратурны характар таго часу. “Часовы камісар № -скай франтавой надзвычайнай камісіі ў справе змагання з контррэвалюцыяй, спекуляцыяй і дэзерцірствам, таварыш Батрачонкаў” [1, с. 124] мае некалькі карыкатурны воблік. Аднак М.Гарэцкі даводзіць, што гэта прыкмета часу, тое, што па вялікаму рахунку можна назваць двайной мараллю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На камісара Батрачонкава з “Незадачы” вельмі падобны таварыш Курапа з апавядання “Апостал”. Абодва героі паказаны мастаком слова ў час іх так званага хаджэння ў народ, куды “адданыя камуністы” едуць вучыць сялян па-новаму жыць, паважаць законы і загады новай улады. У сатырычных фарбах аўтар паказвае неадпаведнасць паміж сутнасцю асобы (Батрачонкаў і Курапа) і яе сацыяльнай роляй. Таму не дзіўна, што з-пад масак галоўных дзеючых персанажаў пачынаюць праступаць твары замаскіраваных прыстасаванцаў : з-пад маскі апостала праступае жорсткі начальнік, гатовы да рэпрэсій за непаслушэнства ўладзе (апавяданне “Апостал”), з-пад маскі камісара Батрачонкава (апавяданне “Незадача”) праступае “панок”, якому вельмі падабаецца, што тыя, каго ён прыехаў інспектаваць, ва ўсім імкнуцца яму дагадзіць і ўслужыць. Адсюль зразумелы і недавер сялянства да самаўпэўненых бальшавіцкіх прадстаўнікоў.

Гарэцкі-празаік не карыстаецца з’едлівай сатырай, не выстаўляе на поўнае абсмейванне негатыўныя характары, паводзіны герояў новай савецкай рэчаіснасці. Галоўным сатырычным прыёмам пісьменніка з’яўляецца іронія– прыхаваная лёгкая насмешка і іранічны падтэкст, што дапамагае аўтару зрабіць мастацкі вобраз больш жыццёвым і праўдлівым, прыблізіць яго да рэальнай сітуацыі.

Апавяданне “Фантазія” ўражвае тужлівым настроем. Погляд М.Гарэцкага на тагачасную рэчаіснасць, на лёс Беларусі і яе будучыню тут зусім несуцяшальны : “Пад гулкі грукат гармат, траскатанне стрэльбаў і кулямётаў, пры водбліску страшных пажарышчаў раздаваліся дзікія воплі і балючыя стагнанні забіваных, рэзаных, паміраючых з голаду людзей.

Могілкі і турмы перапоўніліся. Грэх спавіў кожнае сэрца... Крывёю і слязьмі пазаплывалі вочы. Цені памёршых продкаў у смяротнай нудзе стаялі над распятай краінай...” [2, с. 117].

Змрочныя фантазіі, што ўзнікаюць у свядомасці пісьменніка належаць да часу імперыялістычнай вайны і зрухаў у грамадстве пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. З логікі твора вынікае, што бальшавікі, узяўшы ў свае рукі ўладу, у 20-я гады яшчэ не зрабілі нічога для беларускага адраджэння, не ажыццявілі сваіх абяцанняў на права народа да самавызначэння.

Заслуга Гарэцкага як аўтара вышэй названых твораў заключаецца ў тым, што ён ніколі не адступаецца ад гістарычнай праўды, стварае запамінальныя карціны рэальнага жыцця таго часу, малюе не прыдуманыя, штучна вырабленыя характары, а сапраўдныя тыпы, народжаныя пераломнай эпохай рэвалюцыйных падзей. У сувязі з гэтым слушна заўважае В.Козіч: “Перачытваючы старонкі апавяданняў 1920-х гадоў М.Гарэцкага, міжволі адзначаеш, што за ім – графічная карціна жыцця беларускага народа ў абазначаны перыяд. Псіхолаг М.Гарэцкі не дае адназначных “расшыфровак” характараў у абставінах часу. Ён уважліва канстатуе новыя рысы галоўнага складніка нацыянальнай гісторыі, пакуль што толькі зацікаўлена прыглядаецца да іх, не спрабуе вытлумачыць толькі павевамі грамадска-палітычных абставін. У падтэксце ўсіх твораў адчуваецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

народная ацэнка падзей, якая з’яўляецца для аўтара слушнай. Менавіта гэтая адметнасць робіць іх класічнымі, г. зн. кожнае наступнае прачытанне раскрывае таямніцы творчасці празаіка, спрыяе спасціжэнню менталітэту беларусаў” [4, с. 137].

Праблема прыстасавання да новага ладу ў паслякастрычніцкі час гучыць і ў “Сібірскіх абразках” (1926 -1928). Галоўная тэма гэтых абразкоў - лёс беларусаў-перасяленцаў, якія пакінулі родныя мясціны ў пошуках лепшай долі. Пісьменнік-гуманіст хоча разабрацца: ці змаглі яны ў новых умовах жыцця захаваць свае нацыянальныя звычаі, мову, норавы ? Перад намі праходзіць цэлая галерэя вобразаў-беларусаў, якія аказаліся бяспраўнымі, сацыяльна неабароненымі ў параўнанні з мясцовымі жыхарамі. М.Гарэцкага турбуе пытанне вялікадзяржаўнага шавінізму ў поглядах прадстаўнікоў афіцыйных органаў на беларускую мову і дзяржаўнасць Беларусі . “Сібірскія абразкі” прасякнуты пафасам абароны нацыянальных інтарэсаў нашага народа.

Творы класіка беларускай літаратуры Максіма Гарэцкага і сёння даюць магчымасць не толькі адчуць дух эпохі тых 20-х г. мінулага стагоддзя, складанасць і супярэчлівы характар рэвалюцыйных пераменаў, якія адбыліся на гэтым гістарычным этапе развіцця нацыі, але і вызначаюць пазіцыю самога аўтара, дапамагаюць зразумець псіхалогію яго герояў, вучаць берагчы і шанаваць свае карані, багатую і самабытную культуру свайго народа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Літаратура**

1. Бугаёў, Д.Я. Максім Гарэцкі / Д.Я.Бугаёў. – 2-е выд., выпр. і дап. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – 239 с.

2. Гарэцкі, М. Творы: Апавяданні, аповесці / М.Гарэцкі. – Мінск: Маст. літ., 1995. – 446 с.

3. Коваленко, В. Трагическая мечта о буйном колошении... Философия национальной жизни в творчестве М. Горецкого / В. Коваленко // Нёман. – 1995. – №3. – С. 115–129.

4. Козіч, В. “Вязьмо” характараў і абставін у апавяданнях 1920-х гадоў Максіма Гарэцкага / В.Козіч // Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць: XXIII Гарэцкія чытанні: матэрыялы чытанняў, Мінск, 17 красавіка, 2015 г. – Мінск, 2015. – 212 с.

5. Конан, У. Хрысціянскія каштоўнасці беларускай літаратуры / У.Конан // Матэрыялы “круглага стала” “Хрысціянскія каштоўнасці ў Беларусі: захаваныя традыцыі, укаранёныя адукацыяй, адкінутыя бязвер’ем”. – Мінск, 2007. –- 123с.

6. Мушынскі, М.І. Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі. Жыццёвы і творчы шлях Макссіма Гарэцкага / М.І.Мушынскі. – Мінск: Беларуская навука, 2008. – 510 с.